УА ―Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Факультэт дадатковай адукацыі

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы прарэктар БДУКМ
________________ Ю.П.Бондар
―___” ________________2012 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

# Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы

спецыяльнасці перападрыхтоўкі
1-23 02 71 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія
кваліфікацыя: *бібліятэкар-бібліёграф*
у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам перападрыхтоўкі,
зацверджаным 03.11.2010 г., рэг.№ 25-17/189

Мінск 2012

Распрацоўшчык праграмы:

С.В.Зыгмантовіч, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэкамендавана да зацвярджэння:

Саветам факультэта дадатковай адукацыі УА “Беларускі дэяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

Навукова – метадычным саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Пратакол паседжання ад ____________ № ______

# УВОДЗІНЫ

Вучэбная дысцыпліна «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" з'яўляецца абавязковай для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў вышэйшай кваліфікацыі. Актуальнасць вывучэння гэтай дысцыпліны абумоўлена як фундаментальнай роляй спецыяльных бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесіянальнага светапогляду будучых спецыялістаў, так і неабходнасцю набыцця канкрэтных прафесійных уменняў і навыкаў у арганізацыі і ажыццяўленні разнастайных кірункаў бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Мэтай дысцыпліны "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" з'яўляецца:

- вывучэнне слухачамі пытанняў арганізацы бібліяграфічнай дзейнасці у нашай краіне;

-агульных і асобных (акрамя галіновых) арганізацыйна-тэхналагічных праблем, якія тычацца асноўных напрамкаў практычнай бібліяграфічнай дзейнасці;

-авалоданне тэхналогіяй і методыкай фарміравання і выкарыстання даведачна-бібліяграфічнага апарату, падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў як у традыцыйнай форме, так і бібліяграфічных баз даных, задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў у працэсе бібліяграфічнага інфармавання і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання;

-фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, а менавіта:

- раскрыць арганізацыйныя асаблівасці ажыццяўлення бібліяграфічнай дзейнасці рознымі суб'ектамі сістэмы дакументных камунікацый, напрамкі іх узаемадзеяння на другасна-дакументным узроўні;

- паказаць асаблівасці арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках розных тыпаў;

- разгледзець склад, асаблівасці фарміравання і выкарыстання даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноўнай базы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк;

- раскрыць арганізацыйныя 1 тэхнолага-метадычныя асаблівасці выканання розных кірункаў бібліяграфічнай дзейнасці як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжымах.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны абумоўлівае кола задач, рэалізацыя якіх забяспечыць фарміраванне неабходных для спецыялістаў ведаў, уменняў і навыкаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" будучы спецыяліст *павінен мець уяўленне аб:*

- асноўных цэнтрах бібліяграфічнай дзейнасці і асаблівасцях выканання імі бібліяграфічных функцый у адпаведнасці з займаемым месцам, роляй у сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый грамадства;

- кірунках узаемадзеяння цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў новых умовах выкарыстання аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэння
карпаратыўных сетак з мэтай найбольш поўнага выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў грамадства, рацыяналізацыі працы, і галоўнае, якаснага задавальнення рэальных інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў інфармацыі;

— асаблівасцях структуры бібліяграфічнай службы цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці і ў першую чаргу бібліятэк розных тыпаў;

— складзе даведачна-бібліяграфічнага апарату як асноунай базы бібліяграфічнай дзейнасці, трансфармацыях, звязаных са зменамі ў носьбітах інфармацыі, змесце інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, тэхналогіі вядзення і магчымасцях выкарыстання лакальнага і аддаленага, "віртуальнага" ДБА;

— тэхналогіі выканання розных кірункаў бібліяфафічнай дзейнасці як у традыцыйным, так і ў аўтаматызаваным рэжыме.

У выніку засваення гэтых ведаў будучы спецыяліст *павінен умець выкарыстоўваць:*

— разнастайныя часткі ДБА, крыніцы бібліяфафічнай, фактаграфічнай інфармацыі ў розных кірунках бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці;

— пошукавыя сродкі 1нтэрнет для выяўлення электронных інфармацыйных рэсурсаў, даступных у онлайнавым рэжыме;

— нарматыўна-тэхналагічную дакументацыю для засваення працэсаў, аперацый і іх выканання ў канкрэтных бібліяграфічных установах;

— лепшы вопыт бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, назапашаны рознымі бібліяграфічнымі ўстановамі, а таксама вынікі навуковых распрацовак, накіраваныя на ўдасканаленне бібліяграфічнай дзейнасці.

Вывучэнне курса "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" спрыяе фарміраванню ў будучых спецыялістаў *уменняў і навыкаў:*

— ажыццяўлення ўзаемаадносін з рознымі цэнтрамі бібліяграфічнай дзейнасці;

— камплектавання, арганізацыі і выкарыстання розных частак даведачна-бібліяграфічнага апарату: каталогаў, картатэк, даведачна-бібліяграфічнага фонду, фонду неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў;

— пошуку і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў, якія даступны ў рэжыме аддаленага доступу;

— падрыхтоукі розных відаў, жанраў, формаў бібліяграфічных дапаможнікаў, іх рэдагавання і рэцэнзавання;

— выканання разавых запытаў карыстальнікаў у працэсе даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання;

— ствараць інфармацыйнае асяроддзе ў бібліятэцы і арганізоўваць разнастайныя формы, накіраваныя на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць удзелу слухачоў у пошуку і кіраванні ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

-тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

- тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці;
- праектныя тэхналогіі;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, круглыя сталы, канферэнцыі і інш.);
- метад аналізу вытворчых сітуацый;
- гульнёвыя тэхналогіі, у межах якіх слухачы ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці слухачоў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны ―Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" прадугледжваецца 100 гадзін, з іх 48 – аўдыторныя заняткі (лекцыі – 24, практычныя – 20, семінарскія – 4), 52 гадзіны самастойная работа.

Форма выніковага кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы раздзелаў і тэм | Колькасць гадзін | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ. зан. | семінар. зан. | сам. работа |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **Раздзел 1.** ***Арганізацыйныя пытанні бібліяграфічнай дзейнасці.*** | | | | | |
| ***Тэма 1***. Уводзіны. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларуь | 6 | 2 | | | 4 |
| ***Тэма 2.*** Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. | 12 | 2 | | 2 | 8 |
| ***Тэма 3***. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы. | 6 | 2 | | | 4 |
| **Раздзел II.** ***Арганізацыя, тэхналогія і методыка выканання асноўных напрамкаў бібліяграфічнай дзейнасці*** | | | | | |
| ***Тэма 4.*** Фарміраванне і выкарыстанне ДБА бібліятэкі | 26 | 6 | 8 | | 12 |
| ***Тэма 5.*** Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў | 24 | 4 | 8 | | 12 |
| ***Тэма 6.*** Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк | 10 | 6 | | | 4 |
| ***Тэма 7.*** Фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі | 16 | 2 | 4 | 2 | 8 |
| УСЯГО | 100 | 24 | 20 | 4 | 52 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## УВОДЗІНЫ

### ТЭМА 1. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Прадмет, змест і задачы вучэбнай дысцыпліны ―Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы". Яе месца ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучага спецыяліста. Практычная накіраванасць курса. Яго ўзаемасувязі з іншымі спецыяльнымі прадметамі інфармацыйна-дакументнага цыкла. Асноўныя віды вучэбных заняткаў і арганізацыя самастойнай работы будучых спецыялістаў. Характарыстыка забяспечанасці курса вучэбна-метадычнай літаратурай.

Арганізацыйна-ведамасная раздробленасць як асаблівая рыса арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Арганізацыйная структура бібліяграфічнай дзейнасці, прынцыпы яе арганізацыі: ведамасны, змястоўны, тэрытарыяльны.

Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь: Нацыянальная кніжная палата, бібліятэкі, органы навукова-тэхнічнай інфармацыі, выдавецтвы, кнігагандлёвыя прадпрыемствы, архівы, музеі, сродкі масавай інфармацыі, іх задачы, функцыі, асаблівасці выканання бібліяграфічных кірункаў дзейнасці.

### ТЭМА 2. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Узаемадзеянне бібліяграфічных цэнтраў краіны - аб'ектыўная неабходнасць на шляху фарміравання адзінай інфармацыйнай сістэмы краіны. Асаблівасці узаемадзеяння бібліяграфічных цэнтраў краіны. Узаемадзеянне бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў. Асноўныя ўмовы ўзаемадзеяння бібліятэк: наяўнасць адзінага каардынацыйнага цэнтра; нарматыўных дакументаў аб узаемадзеянні; спецыялізацыі ў дзейнасці. Характарыстыка склаўшыхся асноўных кірункаў каардынацыі і кааперацыі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк. ―Канцэпцыя інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк" (2000 г.) як праграма узаемадзеяння на аснове сеткавых інфармацыйных тэхналогій. Вызначаныя ў ―Канцэпцыі..." кірункі ўзаемадзеяння.

### ТЭМА 3. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэцы

Уяўленне аб бібліяграфічнай службе бібліятэкі ў вузкім і шырокім кантэксце. Задачы, якія стаяць перад бібліяграфічнымі службамі бібліятэк у сучасных умовах. Залежнасць яе арганізацыйна-функцыянальнай структуры ад задач бібліятэкі, яе тыпу, месца бібліятэкі ў сетцы рэгіёна (галіны), спецыялізацыі дзейнасці і зместу бібліяграфічных працэсаў.

Асаблівасці структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў у Рэспубліцы Беларусь. Паняцце аб цэнтралізаваным і дэцэнтралізаваным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характары бібліяграфічнай службы бібліятэкі. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках, якія не маюць бібліяграфічных падраздзяленняў.

Асноўныя функцыі бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі.

### ТЭМА 4. Фарміраванне і выкарыстанне ДБА бібліятэкі

ДБА бібліятэкі – асноўная база бібліяграфічнай дзейнасці. Азначэнне ДБА, яго функцыянальнае прызначэнне, структура. Формы існавання розных частак ДБА. Адзінства прынцыпаў і метадычных рашэнняў у фарміраванні ўсіх частак ДБА.

Каталогі і картатэкі як крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі. Павышэнне ролі зводных каталогаў у перыяд укаранення карпаратыўных тэхналогій і стварэння карпаратыўных сетак бібліятэк. Вопыт работы бібліятэк краіны па фарміраванні зводных каталогаў. Каталогі бібліятэк у Internet. Віды картатэк, іх адрозніванне ад каталогаў. Асаблівасці іх вядзення ў аўтаматызаваным рэжыме і трансфармацыі ў бібліяграфічныя, фактаграфічныя базы даных. Пошукавыя сістэмы ў Інтэрнет як сродак дапамогі выяўлення он-лайнавых інфармацыйных рэсурсаў, іх класіфікацыя, тэхналогія стварэння і выкарыстання.

Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі: склад, функцыянальнае прызначэнне, прынцыпы і крыніцы камплектавання. Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў: прызначэнне, асаблівасці вядзення ў бібліятэках.

### ТЭМА 5. Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў

Асноўныя тэхналагічныя працэсы падрыхтоўчага этапа вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі. Выбар тэмы дапаможніка і яе вывучэнне. Складанне плана-праспекта дапаможніка, яго прызначэнне і змест. Выяўленне дакументаў, мэта і тэхналагічная характарыстыка.

Асноўныя працэсы аналітычнага этапа падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Агульны бібліяграфічны аналіз дакумента: яго мэта і змест. Бібліяграфічнае апісанне і асноўныя патрабаванні да яго. Анатаванне – адзін з асноўных спосабаў бібліяграфічнай характарыстыкі. Віды анатацый. Тэхналогія працэса анатавання. Реферат, яго азначэнне. Тыпавая структура рэферата, вызначаная нарматыўнымі дакументамі. Тэхналогія і метадычныя асаблівасці рэферыравання. Індэксіраванне і прадметызацыя дакументаў. Складанне бібліяграфічных запісаў – канчатковы вынік аналітычнага этапа бібліяграфавання.

Мэты і асноўныя працэсы сінтэтычнага этапа складання бібліяграфічных дапаможнікаў. Адбор дакументаў, яго віды і крытэрыі адбору. Групоўка бібліяграфічных запісаў, яе мэта і асноўныя віды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэты і асноўныя працэсы заключнага этапа падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў. Даведачна-метадычны аппарат бібліяграфічнага дапаможніка і асаблівасці яго падрыхтоўкі. Віды дапаможных паказальнікаў і методыка іх стварэння. Навуковае, літаратурнае і бібліяграфічнае рэдагаванне дапаможніка.

Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі.

## ТЭМА 6. Бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк

Бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя віды.

Бібліяграфічнае інфармаванне. Сутнасць масавага бібліяграфічнага інфармавання. Асноўныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання. Бюлетэні (спісы) новых паступленняў у бібліятэкі. "Дзень інфармацыі": арганізацыя і тэхналогія падрыхтоўкі і правядзення.

Сутнасць і тэхналогія дыферэнцыраванага бібліяграфічнага інфармавання. Формы дыферэнцыраванага бібліяграфічнага інфармавання. Сістэма выбарчага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ) як найбольш эфектыўная форма індывідуальнага інфармавання. Патрабаванні да ВРІ, прынцыпы яго функцыяніравання. Дыферэнцыраванае абслугоўванне кіраўнікоў (ДАК) як падсістэма ВРІ і яе спецыфіка.

Асноўныя формы групавога бібліяграфічнага інфармавання: тэматычныя спісы (бюлэтэні) новых паступленняў, кальцавая пошта, "Дзень спецыяліста": асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення. Асаблівасці дыферынцыраванага інфармавання з выкарыстаннем аўтаматызаванай тэхналогіі.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя элементы. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыем запыта; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыта; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; рэгістрацыя даведкі ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту. Асаблівасці аўтаматызаванай тэхналогіі выканання разавых запытаў.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з выкарыстаннем сродкаў Інтэрнет. Асаблівасці пошука інфармацыі пры дакладным веданні адраса электроннага дакумента, з выкарыстаннем універсальных пошукавых сістэм Інтэрнет. Фарміраванне пошукавага прадпісання. Увод пошукавага прадпісання ў пошукавую сістэму. Уяўленне аб пошукавым інтэрфейсе пошукавай сістэмы.

Ажыццяўленне пошука неабходнай інфармацыі. Выдача вынікаў пошуку ў онлайнавым рэжыме.

Функцыяніраванне служб ―віртуальнай даведкі" ў бібліятэцы як форма онлайнавага даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 7. Фарміраванне бібліяграфічнай культуры арыстальнікаў інфармацыі

Бібліяграфічная культура як састаўная частка інфармацыйнай культуры. Змест паняцця –бібліяграфічная культура”. Павышэнне значэння і ролі бібліяграфічнай, інфармацыйнай культуры асобы ў сучасным умовах. Роля і задачы бібліятэк у фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі. Асноўныя прынцыпы і метадычныя патрабаванні да арганізацыі і зместа работы бібліятэк у гэтым кірунку. Асноўныя напрамкі работы бібліятэк па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: у працэсе арганізаванага навучання ў вучэбных установах; у працэсе фарміравання інфармацыйнага асяроддзя ў бібліятэцы; у працэсе спецыяльна праводзімых мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі.

Асноўныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі: масавыя, групавыя, індывідуальныя. Выкарыстанне бібліятэкамі сродкаў масавай інфармацыі ў разглядаемым кірунку. Перавод традыцыйных форм работы па фарміраванні бібліяграфічнай культуры спажыўцоў у электронныя як сучасная тэндэнцыя дзейнасці бібліятэк.

Асаблівасці фарміравання бібліяграфічнай культуры асобных груп спажыўцоў інфармацыі. Арганізацыя, змест, праграмнае і метадычнае забеспячэнне, выкарыстоўваемыя формы работы бібліятэк розных тыпаў па фарміраванню бібліяграфічнай культуры школьнікаў, студэнтаў, спецыялістаў.

## ТЭМЫ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

1. Бібліяграфічная дзейнасць у век электронных камунікацый.
2. Бібліяграфічныя тэхналогіі: тэарэтыка-метадычныя пытанні.
3. Бібліяграфічная дзейнасць выдавецтваў.
4. Бібліяграфічная дзейнасць кніжных магазінаў.
5. Бібліяграфічная дзейнасць архіваў.
6. Бібліяграфічная дзейнасць сродкаў массавых камунікацый.
7. Бібліяграфічная дзейнасць органаў навукова-тэхнічнай інфармацыі.
8. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.
9. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці публічных бібліятэк.
10. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці універсальных навуковых бібліятэк (на прыкладзе работы … АУНБ).
11. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці спецыяльных навуковых бібліятэк (на прыкладзе работы…).
12. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці навукова-тэхнічных бібліятэк.
13. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці школьных (дзіцячых, бібліятэк ВНУ (на прыкладзе работы асобнай бібліятэкі, бібліятэк пэўнага рэгіёна, галіны).
14. Кніжная палата Беларусі як нацыянальны бібліяграфічны цэнтр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Бібліяграфічная дзейнасць інфармацыйных цэнтраў недзяржаўных форм уласнасці.
16. Узаемадзеянне бібліятэк як бібліяграфічных цэнтраў.
17. Узаемадзеянне бібліятэк і музеяў у галіне бібліяграфічнай дзейнасці.
18. Узаемадзеянне бібліятэк пэўнага рэгіёна ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці.
19. Асаблівасці бібліяграфічнай дзейнасці ва ўмовах функцыяніравання карпаратыўных сетак бібліятэк.
20. Кансорцыумы як форма ўзаемадзеяння бібліятэк у галіне бібліяграфічнай дзейнасці.
21. Нарматыўныя дакументы, рэгламентуючыя ўзаемадзеяння бібліятэк у галіне бібліяграфічнай дзейнасці.
22. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці Беларусі з замежнымі бібліяграфічнымі цэнтрамі.
23. Міжнародныя праграмы, рэгламентуючыя ўзаемадзеянне цэнтраў ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці.
24. (1-3) Бібліяграфічная служба ЦБС, АУНБ, спецыяльных бібліятэк ВНУ:.структура і накірункі дзейнасці.
25. Нарматыўна-тэхналагічная дакументацыя, рэгламентуючая бібліяграфічную дзейнасць бібліятэкі.
26. Даведачна-бібліяграфічны анарат бібліятэкі: тэарэтыка-метадычныя пытанні.
27. (1-5) Асаблівасці ДБА ЦБС АУНБ, спецыяльных навуковых, навукова-тэхнічных бібліятэк, ВНУ.
28. Электронныя даведачныя рэсурсы у ДБФ бібліятэкі.
29. Даведачныя і бібліяграфічныя рэсурсы Internet: аналіз і выкарыстанне ў рабоце бібліятэк.
30. Бібліяграфічныя крыніцы ў ДБФ бібліятэк: сучасны стан і накірункі выкарыстання.
31. Крыніцы рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі: стан і накірункі выкарыстання.
32. Пошукавыя сістэмы ў Internet: характарыстыка і выкарыстанне ў бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк.
33. Даведачна-бібліяграфічны фонд: арганізацыйна-метадычныя пытанні.
34. Картатэкі і базы даных у складзе ДБА бібліятэкі.
35. Крыніцы агульнай бібліяграфіі замежных крыніц і іх выкарыстанне ў рабоце бібліятэк Беларусі.
36. Бібліяграфаванне і пошук аналітычных матэрыялаў электронных часопісаў.
37. Асаблівасці вядзення фактаграфічных БД у бібліятэках.
38. Крыніцы інфармацыі аб базах даных і пошукавых сродках Internet-рэсурсаў.
39. Арганізацыя і выкарыстанне фонда неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў у бібліятэках розных тыпаў.
40. Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў як адзін з асноўных накірункаў дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

41. Анатаванне дакументаў як адзін з працэсаў падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.
42. Рэфераванне дакументаў як адзін з працэсаў падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.
43. Асаблівасці падрыхтоўкі навукова-дапаможных паказальнікаў.
44. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі паказальнікаў зместа перыядычных выданняў.
45. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі дайджэст бюлетэняў (матэрыялаў).
46. Рэфератыўныя бібліяграфічныя крыніцы у Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан.
47. Падрыхтоўка бібліяграфічных баз данных: арганізацыйна-метадычныя асаблівасці.
48. Падрыхтоўка фактаграфічных баз данных: арганізацыйна-метадычныя асаблівасці.
49. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў.
50. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі паказальнікаў праз супрацоўнікаў навуковых арганізацый.
51. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі персанальных бібліяграфічных дапаможнікаў.
52. Метадычныя асаблівасці падрыхтоўкі бібліяграфічных даведнікаў тыпа ―Хто ёсць хто".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Задачы і асноўныя напрамкі бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк.
2. Уяўленне аб ―арганізацыі”, ―тэхналогіі” і ―методыцы” бібліяграфічнай дзейнасці.
3. Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, іх задачы, функцыі, напрамкі работы.
4. Узаемадзеянне цэнтраў бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.
5. Карпаратыўныя праекты ў галіне бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь: характарыстыка.
6. Бібліяграфічная служба бібліятэк: яе арганізацыйна-функцыянальная структура ў бібліятэках розных тыпаў.
7. Асноўныя функцыі бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі.
8. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі.
9. Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі, яго прызначэнне, структура, прынцыпы і метадычныя патрабаванні да яго фарміравання.
10. Структура ДБА. Задачы бібліятэк па фарміраванні ДБА ў новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах.
11. Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі: задачы, прынцыпы фарміравання.
12. Картатэкі бібліятэкі і тэхналогія іх выдзення ў аўтаматызаваным рэжыме.
13. Пошукавыя сістэмы Internet: характарыстыка і выкарыстанне ў рабоце бібліятэкі.
14. Даведачна-бібліяграфічны фонд бібліятэкі, яго структура, асаблівасці камплектавання і арганізацыі.
15. Афіцыйныя выданні і матэрыялы, базы даных прававой інфармацыі ў ДБФ бібліятэк Беларусі, іх функцыянальнае прызначэнне і выкарыстанне.
16. Даведачныя выданні і фактаграфічныя базы даных ў ДБФ, іх выкарыстанне ў бібліятэках Беларусі.
17. Крыніцы агульнай бібліяграфіі, іх асаблівасці і функцыянальнае прызначэнне.
18. Характарыстыка дзяржаўнага бібліяграфічнага паказальніка ―Летапіс друку Беларусі” і штогодніка ―Кнігі Беларусі…”.
19. Крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі, іх функцыянальнае прызначэнне, сучасны стан і накірункі выкарыстання.
20. Крыніцы рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў ДБФ бібліятэкі. Характарыстыка бюлетэня ―Новыя кнігі: па старонках беларускага друку”.
21. Фонд неапублікаваных бібліяграфічных дапаможнікаў, яго арганізацыя ў бібліятэках розных тыпаў.
22. Картатэкі бібліятэкі і тэхналогія іх вядзення ў аўтаматызаваным рэжыме.
23. Тэхналагічная характарыстыка падрыхтоўчага этапа складання бібліяграфічных дапаможнікаў, яго мэты, асноўныя працэсы.
24. Тэхналагічная характарыстыка аналітычнага этапа складання бібліяграфічных дапаможнікаў, яго мэты, асноўныя працэсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

25. Тэхналагічная характарыстыка сінтэтычнага этапа складання бібліяграфічных дапаможнікаў, яго мэты, асноўныя працэсы.
26. Тэхналагічная характарыстыка заключнага этапа падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў, яго мэты, асноўныя працэсы.
27. Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі.
28. Індывідуальнае бібліяграфічнае інфармаванне. Тэхналагічная характарыстыка асноўных форм.
29. Групавое бібліяграфічнае інфармаванне. Тэхналагічная характарыстыка асноўных форм.
30. Асноўныя формы масавага бібліяграфічнага інфармавання: тэхналагічная характарыстыка асноўных форм.
31. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне, асноўныя элементы і тэхналогія.
32. Тэхналогія і методыка выканання тэматычных даведак.
33. Тэхналогія і методыка выканання ўдакладняючых, адрасна-бібліяграфічных і фактаграфічных даведак.
34. Значэнне і задачы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі ў бібліятэках, яго змест, метадычныя патрабаванні, прынцыпы.
35. Масавыя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі ў бібліятэках.
36. Групавыя і індывідуальныя формы фарміравання бібліяграфічнай культуры спажыўцоў інфармацыі ў бібліятэках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1.Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. –1995.- № 20. – Арт.238. – С.8-21.

2.Аб інфарматызацыі: Закон Рэсп. Беларусь // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. – 1995. - № 33. – Арт.428. – С.3-15.

3.Концепция информационного взаимодействия библиотек Беларуси: Разработана в рамках Программы развития единой компьютерной сети Республики Беларусь (НИКС РБ) и утверждена на засед. Респ. библиотечного Совета при Мин-ве культуры 3.03.2000 г. /Бел.библиотеч. ассоциация. – Мн.: ИООО «Красико- Принт», 2001. – 47 с.

4.Выданні. Асноўныя віды. Тэрміны і азначэнні. – СТБ 7.60-93. – Мн., 1993. – 44 с.

5.Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения: Межгос. стандарт. – ГОСТ 7.0-99. СИБИД. – Мн.: Белстандарт, 1999. – 23 с.

6.Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения: Межгос. стандарт. – ГОСТ 7.76-96. – Мн., 1998. – 34 с.

7.Реферат и аннотация. Общие требования: Межгос. стандарт. – ГОСТ 7.9-95. – Мн., 1999. –8 с.

8.Березкина, Н.Ю. Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси / Н.Ю.Березкина, Л.А.Авгуль, Б.Б.Невский. – Мн.: ИООО «Красико-Принт», 2002. - 144 с.

9.Зыгмантовіч С.В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці: вучэб. дапаможнік /С.В.Зыгмантовіч. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.

10.Коготков, Д.Я. Библиографическая деятельность библиотеки: организация, управление, технология: Учебник / Д.Я.Коготков. – СПб.: Профессия, 2003. – 304 с.

11.Леонов, В.П. Реферирование и аннотирование научно-технической литературы /В.П.Леонов – Новосибирск, 1986. – 176 с.

12.Лявончыкаў, В.Е. Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: Падручнік / В.Е.Лявончыкаў – Мн.: Вышэйш. шк., 1991. – 258 с.

13.Моргенштерн, И.Г. Справочно-библиографическое обслуживание в библиотеках: Науч.-практ. пособие / И.Г. Моргенштерн – М., 1999. – 79 с.

14.Справочник библиографа / Науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – СПб.: Профессия, 2002. – 528 с. (Серия «Библиотека»).

15.Справочник библиотекаря / Науч. ред. А.Н.Ванеев, В.А.Минкина. – Изд. 2-е, исправл. и доп. - СПб.: Профессия, 2001. – 439 с. (Серия «Библиотека»).

16.Степанов, В. Практические уроки: Интернет для библиотекарей (С компьютером на «ты». Вып. 2) / В.Степанов. – М., 1998. – 64 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17.World  Wide Web – стратегия эффективного поиска: Справ. для б-к /РНБ; Сост. И.С.Галеева и др. – СПб., 2001. – 207 с.

**Дадатковая**

1.Алёшин, Л.И. Электронные базы данных персоналий / Л.И.Алёшин // Библиография. – 1999. - №1. – С.28-30.

2.Барышева, О.В. Библиография в эпоху электронной коммуникации / О.В.Барышева, Р.С.Гиляревский // Библиография. – 1999. - № 6. – С.3-13.

3.Берестова, Т.Ф. СБА универсальных библиотек: модные веяния и устойчивые тенденции / Т.Ф.Берестова // Библиография. – 1997. - № 4. – С.49-54.

4.Брежнева В.В. Информационное обслуживание: продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами инфармации предприятий / В.В.Брежнева, В.А.Минкина; СПбГУКИ. – СПб.: Профессия, 2004. – 304 с. – (Серия «Библиотека»).

5.Васильева, Т.А. Комплектование и организация компактных оптических дисков в универсальных научных библиотеках / Т.А.Васильева, В.Ю.Елесина // Науч. и техн. б-ки. – 1997. - №2. – С.76-81.

6.Гиржон, А.А. К вопросу организации учета баз данных / А.А.Гиржон // Информационные технологии в библиотеках на рубеже веков: проблемы, поиски, решения: Материалы междунар. науч.-практ. конф. – Мн., 1999. – С.133-136.

7.Жабко, Е.Д. Справочно-библиографическое обслуживание в 1990-е годы: тенденции развития // Информационно-библиографическое обслуживание. Вып.1.История и современное состояние: сб.статей /Рос. Национальная библиотека. – СПБ., Изд-во «Российская национальная библиотека», 2003. - 192 с.

8.Зыгмантовіч, С.В. Бібліятэкі ў сістэме фарміравання інфармацыйнай культуры асобы / С.В.Зыгмантовіч // Бібліятэчны свет. – 2002. - № 4. – С.10-12.

9.Ильина, И.И. Как пользоваться Российской библиографией на СД-РОМ / И.И.Ильина, Д.М.Гитер, М.Б.Лавринович // Мир библиографии. – 1999. - № 3. – С.8-10.

10.Капырына, А. Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ва ўмовах аўтаматызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў /А.Капырына // Бібліятэчны свет. – 1997. - №2. – С.8-10.

11.Майстрович, Т.В. Доступ пользователей к машиночитаемым источникам информации / Т.В.Майстрович // Науч. и техн. б-ки. – 1998. - № 4. – С.35-39.

12.Минкина, В.А. Формирование информационной культуры личности / В.А.Минкина, В.В.Брежнева // Мир библиографии. – 1998.- №3. – С.21-23.

13.Мотульский, Р.С. Международное сотрудничество библиотечно-информационных учреждений Республики Беларусь / Р.С.Мотульский // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 2. – С.31-34.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14.Пилко, И.С. Технологическое обеспечение производства библиографических продуктов и услуг / И.С.Пилко // Науч. и техн. б-ки. – 1990.- №1. – С. 11-15.

15.Пилко, И.С.Электронный библиографический сервис: расчёты и просчёты / И.С.Пилко, Л.Г.Тараненко // Библиография. – 2000.- №6. – С.3-7.

16.Романенко, В.Н. Сетевой информационный поиск: практ. пособие / В.Н.Романенко, Г.В.Никитина; Российская академия естественных наук. Северо_Западное отделение образования и развития науки. – СПб.: «Профессия», 2003. – 288 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Практычная работа № 1

## ТЭМА: *Даведачныя і бібліяграфічныя рэсурсы ў Internet.*

### Частка 1. Даведачныя рэсурсы ў Інтэрнет.

**Мэта заняткаў:** пазнаёміцца з асноўнымі даведачнымі рэсурсамі, прадстаўленнымі ў Internet, прааналізаваць іх змястоўныя і пошукавыя магчымасці.

**Ход выканання задання:**

1. Загрузіць браузер Internet Explorer. Гэта можна ажыццявіць двума шляхамі: двайным шчаўчком мышы па адпаведнай піктаграме на рабочым стале MS Windows; альбо ажыццявіць каманды Пуск / Праграмы / Internet Explorer.
2. У бягучым акне Internet Explorer падключыцца да пашуковых сістэм (ПС) бо каталогаў Internet-рэсурсаў. Для гэтага шчоўкнуць мышшу ў поле “Адрас” і набраць адзін з адрасоў замежных, бо расійскіх ПС:

   http://www.yahoo.com

   http://www.//www.google.com

   http://www.yandex.ru

   http://rambler.ru

   http://aport.ru

**Для запуску пошукавай сістэмы націскнуць кнопку Enter(Найти).**

3. Праглядзець адчыніўшуюся старонку і прааналізаваць, з якіх катэгорый складаеццца меню асноўнага рада. выбраць з асноўнага рада патрэбныя катэгорыі: «Справочники», «Словари», «Энциклопедии», «Переводчики». Данныя катэгорыі могуць быць прадстаўлены на англійскай мове: “Reference”, “Dictionaries”, “Encyclopedia” і г.д. Шчоўкнуць мышшу па адпаведнай катэгорыі і, паступовa раскрывая адну за другой спасылкі, знайсці даведачныя рэсурсы.

Другі шлях пошука па ўказанай пошукавай сістэме: шляхам непасрэднага ўвода ключавых слоў у пошукавую страку “Найти”, размешчаную ў верхняй частцы інтэрфейса / Enter.

**4**. Прааналізаваць: доступ да якіх энцыклапедый, даведнікаў, слоўнікаў арганізуюць розныя пошукавыя сістэмы.

Пры знаемстве непасрэдна з электроннымі энцыклапедыямі, даведнікамі, слоўнікамі звярнуць увагу на іх назву, размяшчэнне матэрыяла, пошукавыя магчымасці з выкарыстаннем гіпертэкставых спасылак, наяўнасць розных відаў інфармацыі акрамя тэкставай (даць па аднаму прыкладу розных відаў даведачных выданняў і іх кароткую характарыстыку).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5**. Пошук даведачных электронных рэсурсаў можа ажыццяўляцца і непасрэдна па іх адрасах, сайтах, якія спецыялізіруюцца на прадстаўленні электронных даведачных рэсурсаў.

Для пошука неабходных выданняў увядзіце ў поле ―Адрас" наступныя адрасы і ажыццявіце пошук розных відаў даведачных выданняў:

- *замежных:*

Britannica Online

http://www.britannica.com

Энцыклапедыя Microsoft Encarta

http://encarta.msn.com/EncartaHome.asp

Encyclopedia. Com

http://www.encyclopedia.com

Information Please

http://www.infoplease.com

- *расійскіх:*

Мир энциклопедий, Энциклопедии в сети

http://www.encyclopedia.ru/internet/html

словари, справочники, энциклопедии

http://www.vocabencycldict.cjb.net

«Кирилл и Мефодий»

http://www.km.ru http://www.mega.km.ru

талковых універсальных слоўнікаў і слоўнікаў скарачэнняў:

http://russia.agama.com/oz_demo.htm

http://www.est.ru/abbrolict-r.htm

http://www.m-w.com/netolict**. htm**

http://www.thesaurus.com

слоўнікаў для перaклада:

http://www.translate.ru/rus

**6.** Праглядзіце прадстаўленыя даведачныя рэсурсы з дапамогай адной з беларускіх пошукавых сістэм:

http://open.by **(сістэмы Open.by)**

http://tut/.by

www.zubr.com **(рэгістра беларускіх www-рэсурсаў Зубр)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

http://akavita.net **(беларускай рэйтынгавай сістэмы Акавіта)**

**7.**Ажыццявіце пошук адраснай інфармацыі аб арганізацыях, выкарыстоўвая наступныя сайты:

http://www.altavista.com**, спасылка Yellow Pages**

http://www.yahoo,com**, спасылка Yellow Pages**

бо аб асобах:

http://www.whowhere.com

http://www.altavista.com**, спасылка People Finder**

http://www.eros.dubna.ru

http://www.minsk**2000.to**

## Частка 2. Бібліяграфічныя рэсурсы ў Internet.

**Мэта заняткаў:** пазнаеміцца з асноўнымі бібліяграфічнымі рэсурсамі ў Internet, прадстаўленнымі ў выглядзе каталогаў бібліятэк, зводных каталогаў, бібліяграфічных і рэфератыўных БД, засвоіць алгарытм іх пошуку, прааналізаваць іх змястоўныя і пошукавыя магчымасці.

**Ход выканання:**

1. Запусціць браузер Internet Explorer
2. Ажыццявіць пошук бібліяграфічных матэрыялаў, выкарыстоўвая магчымасці каталогаў Internet-рэсурсаў, пошукавых сістэм:

*-замежных:*

**Yahoo- (**http://www.yahoo/com**)**

**Altavista-(**http://www.altavista.com.**)**

**Google-(**http://www.//www.google.com**)**

*-расійскіх:*

**list.ru(**http://www.list.ru**)**

**Yandex(**http://www.yandex.ru**)**

**Rambler(**http://www://www.rambler.ru**)**

*-беларускіх:*

**Рэгістра беларускіх www- рэсурсаў Зубр-** www.zubr.com

**Сістэмы TUT.BY –** http://tut.by

Праз выкарыстанне катэгорый меню асноўнага рада «Библиография», «Библиотека», «Каталоги», «Книги», «Базы данных», бо на замежнай мове: ―Bibliography‖, ―Library‖, ―Catalog‖, ―Book‖.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2.1.** Другі шлях пошука па ўказанай пошукавай сістэме: шляхам непасрэднага ўвода ключавых слоў у пошукы радок ―Найти‖, размешчаную ў верхняй частцы інтэрфейса.

3. Пошук бібліяграфічных электронных рэсурсаў можа ажыццяўляцца і непасрэдна па іх адрасах, сайтах, якія спецыялізіруюцца на прадстаўленні бібліяграфічнай інфармацыі.

Для пошука неабходных выданняў увядзіце ў поле ―Адрас‖ наступныя адрасы і ажыццявіце пошук розных відаў крыніц бібліяграфічнай інфармацыі:

*-каталогаў наступных бібліятэк:*

**Нацыянальнай бібліятэкі РБ –** http://natlib.org.by

**Бел СГБ – http://** www.belar.-minsk.by

**Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа –** http://libcat.bas/-net.by

**РНТБ –** http://www.gpntb.ru

**Каталог:** http://www.gpntb.ru/win/search

**Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі –** http://www.rsl.ru

**Каталог:** http://www.rsl.ru/r_resl.htm

**Расійскай нацыянальнай бібліятэкі –** http://www.nlr.ru

**Каталог:** http://www.nrlru/poisk/r_book.htm

**Бібліятэкі Кангрэса ЗША –** http://www.loc.gov

*- бібліяграфічных баз даных:*

**Расійскай кніжнай палаты- http://**www.bookchamber.ru

**Інстытута навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках-** http://www.inion.ru

**ВИНИТИ –** http://www.fui.viniti.msk.ru

**4.** Прааналізаваць інтэрфейс і вызначыць магчымасці пошуку па бібліятэчным каталогам:

- па якім пошукавым прыметам можа весціся пошук;
- ці ёсць убудаваныя слоўнікі (якія?)
- ці дапускаецца пошук з усячэннем тэрмінаў;
- якія віды выданняў адлюстраваны ў каталозе;
- у якой форме выдаецца адказ на запыт, з чаго складаецца бібліяграфічны запіс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Практычная работа № 2**

**ТЭМА:** ***Параўнальны аналіз другасных дакументаў***

**<u>МЭТА:</u>** авалоданне практычнымі навыкамі логіка-граматычнага падыходу да адрознівання (распазнавання) другасных дакументаў (ДД).

**<u>Заданне:</u>** даць прыклады даведачнай анатацыі, рэфратыўнай анатацыі, рэферата і рэкамендацыйнай анатацыі.

**<u>Методыка выканання:</u>** Кожны слухач**,** выкарыстоўваючы логіка-граматычны падыход, павінен знайсці ў рэфератўным часопісе Усерасійскага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі ―Інфарматыка” і прывесці па адным прыкладзе даведачнай анатацыі, реэфератыўнай анатацыі і рэферата з рэкамендацыйнага паказальніка – рэкамендаыйную анатацыю. Лагічны (змястоўны) аналіз прадугледжвае вызначэнне ў сказах другасных дакументаў суб’ектыўнай анатацыі і рэферата, з рэамендацыйнага паказальніка – рэкамендацыную анатацыю. Лагічны (змястоўны) аналіз прадугледжвае вылачэнне ў сказах другасных дакументаў суб’ектва думкі (тэмы) і прэдыкта думкі (рэмы), а на ўзроўні тэкстаў – тэкставага суб’екта і тэкставага прэдыката. Сказы, якія змяшчаюць у сабе толькі суб’ект думкі (тэму), называюцца *анатыўнымі.* У іх называюцца, але не раскрываюцца тэмы, якія вызначаюць аспекты зместу ДД, - аб чым ён. У гэтым выпадку мы маем справу з ―чыстай” *даведачнай анатацыяй.*

Гэтыя анатацыі можна таксама распазнаваць і з дапамогай граматычных (фармальных) сродкаў: сказы, як правіла, падчынаюцца славеснымі клішэ (маркерамі) тыпу: ―аналізуюцца…”, ―паведамляецца аб…”, ―разглядаюцца…”, ―прыведзены …”, ―сфармуляваны …”, ―асаблівая ўвага ўдзяляецца…”, ―гаворыцца аб …” і г. д.; такім чынам, на першым месцы ў гэтых сказах стаіць выказнік, прадстаўлены дзеясловам у зваротнай ці пасіўнай форме.

Сказы, якія змяшчаюць у сабе думкі, называюцца *рэфератыўнымі,* а скдадзеныя з іх ДД – *рэфератамі. Рэферат* раскрывае, што менавіта змяшчаецца ў першасным дакуменце, гэта значыць, выкладае яго змест (паведамляе асноўныя фактычныя і тэарэтычныя звесткі). Акрамя гэтага рэфератыўныя сказы можна адрозніваць і з дапамогай маркераў тыпу: ―выказваюцца меркаванні, што…”, ―робяцца вывады аб тым, што…”, ―адзначаецца, што…”, ―указваецца, што…” і інш.

Акрамя ―чыстых” анатацый і рэфератаў, існуюць ДД, у якіх сустракаюцца як анататыўныя, так і рэфератыўныя сказы. У гэтым выпадку мы маем справу з *рэфератыўнай анатацыяй* - сінтэтычным дакументам, у якім раскрываюцца некалькі аспектаў першаснага дакумента з рознай глыбінёй згортавання: ад анатацый (пералік тэм тэксту) да рэферата (выкладанне якога-небудзь аспекта). У іх знаходзяцца як анатыўны, так і рэфератыўныя маркеры.

Аналагічным чынам па крыніцах рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі неабходна знайсці прыклад рэкамендацыйнай анатацыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпісаць у сшытак. Затым прывесці структурны аналіз тэксту выпісаных другасных дакументаў і вызначыць, якія аспекты першасных дакументаў у іх адлюстраваны, параўнаць іх з той структурай анатацыі, рэферата, якая прапанавана ў міждзяржаўным стандарце «Реферат и аннотация».

Абапіраючыся на вынікі аналітычнай работы, а таксама веды, атрыманыя на лекцыі, кожны слухач павінен самастойна скласці на адзін і той жа артыкул часопіса даведачную і рэкамендацыйную анатацыю, а таксама рэферат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Практычная работа №3**

**ТЭМА:** ***Выкананне бібліяграфічных (тэматычных, адрасна-бібліяграфічных, удакладняльных) і фактаграфічных даведак..***

**МЭТА:** навучыць слухачоў вызначаць тып запытаў і з дапамогай асноўных крыніц агульнай і спецыяльнай бібліяграфіі, даведачных выданняў, Internet –рэсурсаў іх выконваць.

**Заданне:** выканаць варыянт задання, які складаецца з дзесяці розных запытаў.

**Методыка выканання.** Кожны слухач атрымоўвае індывідуальны варыянт з ―Задачніка па бібліяграфічным пошуку". Слухач павінен устанавіць тып запыту, яго пошукавыя прыметы, крыніцы і шляхі пошуку, а затым непасрэдна ажыццявіць пошук і знайсці адказ на запыт. Схема афармлення практычнай работы прыведзена ў дадатку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ